# БЕЛАРУСКІ ТЭАТР.

Ачуняушы пасьля моцнага распаду у часы панаваньня у нас бальшавікоу, тэатр наш прадстауленьнем у нядзелю „Паулінкі“ Я. Купалы дае знаць аб сабе першы раз за увесь час пасьля заняцьця Менску палякамі. Вядомая камэдыя Купалы у выкананьні нашых маладых аматарау-артыстау (Т-во працаунікоу Беларускага Мастацтва) прайшла даволі гладка. Панна Зароская (Паулінка) саусім у сваей ролі. Натуральная, засьцянковая шляхцяначка, яна вяла сваю ролю крыху натхненна але праудзіва, шкада толькі, што у песьнях яе

гладкі мяшастовы голас зьвінеу слабавата. Затое, непакрыуджаная прыродаю, артыстка, як мае быць выігрывае сваею фігураю, жывою, выразнаю мімікаю і поуным драматызмам, у канцы пьесы. Добраю парою для яе быу п. Галубок (Быкоускі). Адсутнасьць оркестара давала сябе чуць. Полька прайшла занадта шпаркім тэмпам, хаця зрабіла на публіку моцнае уражэньне, ажно артысты муселі выступіць на „біс“. Ад бязсьмертнае нашае „Лявонiхі“, уражэньне было яшчэ мацнейшае. Музыку заменьвау хор п. Цяраускага, які пасьля спэктаклю выканау шмат сольных і харавых номэроу, куды увайшлі новые народные песьні: „Цалі у печы“, „Ой пьяна я пьяна“ і уласны „Гымн грацаунікоу Беларускага Мастацтва“.

Можна сьмела сказаць, што вядомы гэты хор з кожным разам ідзе у гару і толькі матэрьяльные недастаткі не пазваляюць яму разьвінуцца на усю моц. Пажадаем яму і у гэтым сэнсе стаць на ногі, каб можна было абьезьдзіць нашы сонные провінцыяльные куткі, а мо' й за межамі Беларусі ня грэх было б паказацца, бо паказаць, здаецца маем што.

Можам-толькі выказаць пажаданьне і надзею, што сьледам за „Паулінкаю“ нашы маладые артысты не засгавяць доуга чакаць на чарговую пьесу сваiго рэпэртуару.

**Знаемы.**